# «Дзівак з Баброўні»

**Ільля БАРЫСАЎ**

**Імя Міхася Васілька (Міхаіла Восіпавіча Касцевіча), знакамітага паэта-самародка з вёскі Баброўня Гродзенскага раёна, вядома не толькі на Гродзеншчыне.**

Ведаў я яго яшчэ з дзіцячых гадоў. Бацькі мае жылі непадалёку ад цэнтра мястэчка Скідзель, дзе кожны аўторак праводзіліся кірмашы. Тут можна было не толькі штосьці прадаць ці купіць, але і павесяліцца. Мы, падлеткі васьмі-дзесяці гадоў, заўсёды займалі першыя рады. Цікавасць гледачы праяўлялі да многіх артыстаў. Але найбольш даспадобы былі выступленні Міхася Васілька, які чытаў свае вершы, поўныя гумару і смеху, падмацоўваючы іх крытычнымі малюнкамі, якія дэманстраваў яго сябра-аднавясковец. Мястэчковыя ведалі Міхася Васілька як "дзівака з Баброўні". А мастаком-сатырыкам быў Рыгор Каскевіч. Асабліва даспадобы гледачоў быў верш Міхася пад назвай "Як я пана перанёс" і малюнак Рыгора, дзе мужык у ярме цягне плуг, а побач пан-таўсцяк аратага падганяе пугай.

Не думаў і не гадаў я тады, што прыйдзецца сустрэцца з Міхасём, толькі ў іншых абставінах, нават пабываць у яго маленькай, але добра дагледжанай сялянскай хаце. Адбылося гэта восенню сорак чацвёртага года, пасля вызвалення Гродзеншчыны ад нямецкіх захопнікаў. Ваенкамат даў мне заданне пабыць у вёсцы Баброўня і сустрэцца з ваеннаабавязаным Іпатам Курыла, даведацца, па якой прычыне ён не з'яўляецца на прызыўны пункт. Сеўшы на каня, якога выдзеліў мне старшыня Глінянскага сельскага Савета Бараноўскі, паспяшаў у Баброўню, што за дзесяць кіламетраў ад райцэнтра. Зайшоў у адну хату. Аказалася, што папаў да «дзівака з Баброўні», вядомага мне з польскіх часоў. Паведаў яму, па якіх я справах аказаўся ў вёсцы. Зразумеўшы важнасць задання, Міхась адгукнуўся дапамагчы.

– Цяпер Іпаліта няма ў хаце, – канстатаваў Міхась, – але мы паспрабуем яго адшукаць.

І павёў мяне Міхась па вясковай вуліцы, якая цягнулася ўздоўж высокага берага ракі Котра, затым перайшлі мост і аказаліся ў гушчары кустоўя. Я насцярожыўся. Гэта заўважыў Міхась і лагодна сказаў: "Не бойся". Глыбей у лесе выйшлі да самагоннага апарата, каля якога мітусіўся чалавек. Убачыўшы нас, разгубіўся. Пасля размовы, у якой прыняў актыўны ўдзел і Міхась Васілек, Іпат паабяцаў з'явіцца ў ваенкамат.

Сустрэўся я з Міхасём Васільком ужо праз гады, калі ён стаў працаваць у газеце "Гродзенская праўда". Гутарылі доўга, успамінаючы польскія часы жыцця, людныя кірмашы.

У маім асабістым архіве захоўваюцца ўспаміны пра Міхася актывісткі гуртка Таварыства Беларускай школы ў 30-я гады Надзеі Якаўлеўны Кліменка. Яна таксама ўспамінала канцэрты у вёсцы Баброўня, босага, у саматканых портках вяскоўца, які чытаў вершы на роднай мове, гэта быў паэт-самародак Міхась Васілёк.



*Фота зроблена аўтарам у музеі Міхася ВАСІЛЬКА ў Скідзелі*

У гэтыя ліпеньскія дні бягучага года я сустрэўся з былым вяскоўцам Міхася Васілька Міхаілам Мацвеевічам Курыла. Ён успамінаў:

– Міхась Васілёк з маім бацькам сябравалі. У час вайны Міхась актыўна ўключыўся ў падпольную дзейнасць, быў абраны сакратаром Скідзельскага антыфашысцкага камітэта. Калі ў ліпені сорак чацвёртага года Гродзеншчына была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Міхась стаў працаваць у рэдакцыі раённай газеты "Чырвоны сцяг", а затым у "Гродзенскай праўдзе".

Міхась быў вельмі дружалюбны з людзьмі ўсіх узростаў, ніколі нікога не крыўдзіў і не даваў іншых у крыўду. Ён быў сапраўдным беларусам, вялявым і душэўным чалавекам.

**Ільля БАРЫСАЎ**